70 гадоў 1945-2015 Вялікай Перамогі

ЗАЛА № 5. «Карэнны пералом у ходзе вайны. Савецкі тыл»

Працягваем віртуальнае падарожжа па Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

Поспехі савецкіх войскаў пад Сталінградам, Курскам і на Дняпры прадвызначылі далейшы ход не толькі Вялікай Айчыннай, а і Другой сусветнай войнаў. Гэта былі нябачаныя паражэнні гітлераўцаў. Страціўшы велізарную армію і магутную баявую тэхніку, яны былі асуджаны на правал. Чырвоная Армія перайшла ў контрнаступленне.

ФРАНТАВЫ ДРУК

Франтавы друк, якому прысвечаны адзін з раздзелаў экспазіцыі, адлюстроўваў баявы вопыт чырвонаармейцаў, дапамагаў ім авалодаць ваеннай тэхнікай, мабілізоўваў народ на знішчэнне ворага. У падпольных рэдакцыях працавалі многія вядомыя пісьменнікі: Міхась Лынькоў, Максім Танк, Пімен Панчанка, Пятрусь Броўка, Анатоль Куляшоў і іншыя. У музеі захоўваецца вышытая сурвэтка з надпісам «Папочке от Люды», якую ў падарунак ад дачкі атрымаў супрацоўнік франтавой газеты «За Совецкую Беларусь» Кандрат Крапіва. На фотаздымках — знакамітыя франтавыя карэспандэнты, наборшчыцы, салдаты, якія з цікавасцю чытаюць свежы нумар газеты. Напэўна, адну з яе публікацый набіраў на сваёй друкавальнай машынцы, якая прадстаўлена ў экспазіцыі, і літаратурны супрацоўнік рэдакцыі газеты «Красное Знамя» малодшы лейтэнант Пётр Пятровіч.

Дыван з партрэтам камандуючага Данскім фронтам генерал-лейтэнанта Ракасоўскага ў 1974 годзе перадала ў музей сям'я славутага военачальніка.

У военным друку адлюстроўваліся і дыпламатычныя адносіны з саюзнікамі. У музеі можна ўбачыць некаторыя рэчы, якія Савецкі Саюз атрымліваў са Злучаных Штатаў Амерыкі па ленд-лізе: пісталеты-кулямёты Томпсана і Рэйзінга, лекі, біноклі, сумкі, вопратку... Закон аб ленд-лізе быў прыняты 11 сакавіка 1941 года Кангрэсам ЗША. Ён прадугледжваў перадачу ў пазыку, арэнду або іншым спосабам ваенных матэрыялаў і тавараў, неабходных для абароны дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі. У Савецкі Саюз дапамога пастаўлялася па трох шляхах. Найбольш бяспечнымі і доўгімі былі пастаўкі праз Уладзівасток і Іран. Самымі хуткімі, але не вельмі надзейнымі — праз Мурманск.

Чалавекам, які меў непасрэднае дачыненне да гэтых паставак, быў ураджэнец Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці Канстанцін Лукашоў. З 1942 года ён з'яўляўся намеснікам старшыні Савецкай урадавай закупачнай камісіі па ленд-лізе ў Вашынгтоне. У вітрыне — фрак Лукашова, медыкаменты амерыканскай вытворчасці, прывезеныя яго сям'ёй з ЗША. Тут жа і яго пасведчанне акадэміка Акадэміі навук БССР. Многія гады прафесар Лукашоў працаваў на навуковай ніве: быў рэктарам Белдзяржуніверсітэта імя Леніна, дырэктарам інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР.

Каб зберагчы народнае дабро ад вайны, з Веткі, што на Гомельшчыне, у Саратаўскую вобласць была ажыццёўлена эвакуацыя кароў, авечак і коней. На працягу пяці месяцаў па тысячакіламетровым шляху, які пралягаў праз пяць абласцей, статак з 700 галоў гналі ўсяго некалькі падлеткаў і жанчын. Пра подзвіг гэтых людзей і падрабязнасці эвакуацыі, якую ўзначаліла Пелагея Барадзіна, мы расказвалі раней (нумар за 20 чэрвеня 2015 года).

«ШКОЛА ВУЛІЧНЫХ БАЁЎ» І ДЫВАН РАКАСОЎСКАГА

Летам 1942 года ў данскіх і прыволжскіх стэпах разгарнулася Сталінградская бітва. Адна з найбуйнейшых і вырашаючых падзей Вялікай Айчыннай вайны доўжылася 200 дзён і начэй. Нямала беларусаў загінула пад Сталінградам. Апошнім прытулкам горад на Волзе стаў і для дырэктара Ульскай школы Бешанковіцкага раёна Уладзіміра Яцкевіча. Яго кашулю — з вышытым арнаментам — у музей перадаў сын Уладзімір. Ён неаднойчы ездзіў на месца, дзе загінуў бацька. Адтуль, дарэчы, прывёз экспанаты, змешчаныя ў інсталяцыі музея «Баі ў горадзе».

У баях на подступах да Сталінграда дапамагаў параненым вайскоўцам санінструктар Іван Нікіценка. 24 ліпеня 1942 года гамяльчанін быў паранены. Варожая куля прабіла камсамольскі білет, які захоўваўся ў нагрудней кішэні. Нягледзячы на цяжкае раненне, старшы лейтэнант удзельнічаў у вызваленні Беларусі і дайшоў да Берліна. У экспазіцыі можна ўбачыць і шлемафон Героя Савецкага Саюза гвардыі капітана Антона Аляхновіча, які ў баях за Сталінград здзейсніў 186 баявых вылетаў. Ён стаў адзіным лётчыкам авіяцыі далёкага дзеяння, які за ўсю вайну пралятаў на адным і тым жа бамбардзіроўшчыку «Іл-4», ды яшчэ з тым жа экіпажам.

Сталінград называюць «школай вулічных баёў». І невыпадкова. У верасні 1942 года, калі вораг пачаў штурм горада, баі вяліся за кожную вуліцу, за кожны дом. Менавіта ў Сталінградзе былі сфарміраваны штурмавыя групы, якія вялі вулічныя баі. Уявіць абмундзіраванне байца падраздзялення дапамагаюць такія экспанаты, як пісталет-кулямёт Шпагіна, ранцавы агнямёт «РОКС-3», стальны нагрудник «СН-42», гранаты «РГД-33» і «Ф-1», нож, сапёрныя лапатка і нажніцы, плашч-накідка.

Асколак, які прабіў фотаздымак, стаў смяротным для лейтэнанта Фёдара Падсадніка.

Можна ўбачыць фотаздымак будынка ўнівермага на плошчы Палеглых змагароў, у склепе якога размяшчаўся і быў узяты ў палон штаб 6-й арміі на чале з генерал-фельдмаршалам Паўлюсам. 31 студзеня 1943 года дэлегацыю па прыёме капітуляцыі ўзначаліў начальнік штаба 64-й арміі Сталінградскага фронту генерал-маёр Іван Ласкін. У музеі прадстаўлены ўзнагародны комплекс Івана Андрэевіча, у тым ліку і ордэн Чырвонага Сцяга, якім ён быў узнагароджаны за абарону Сталінграда. Немалая заслуга ва ўзяцці ў палон буйнога нямецкага военачальніка і вядомага палкаводца Канстанціна Ракасоўскага. Як напамін — падарунак, які за разгром групоўкі праціўніка пад Сталінградам Канстанціну Канстанцінавічу паднеслі туркменскія ткачыхі. Дыван з партрэтам камандуючага Данскім фронтам генерал-лейтэнанта Ракасоўскага ў 1974 годзе перадала ў музей сям'я славутага военачальніка.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ГЕРОІ КУРСКА

Арыгінальна прадстаўлена тэма бітвы пад Курскам. Ты быццам знаходзішся ў акопе, з якога назіраеш за тым, што адбываецца навокал — такім чынам становішся ўдзельнікам падзей на Курскай дузе. Эфект прысутнасці дапамагаюць стварыць кадры з кінаэпапеі Юрыя Озерава «Вызваленне».

З фотаздымкаў, змешчаных побач, на нас глядзяць удзельнікі бітвы. Напрыклад, батарэя пад камандаваннем Данііла Чмараткова ў баі 5 ліпеня 1943 года адбіла 6 атак праціўніка, знішчыла «тыгр» і тры «фердынанды». У крытычны момант бою камбат выклікаў агонь на сябе. Быў цяжка паранены, пазбавіўся нагі. Пагоны, планшэт і блакнот нагадваюць пра подзвіг Чмараткова. Побач — артылерыйскія прыборы і бранзалет ад наручнага гадзінніка, пашкоджанага куляй. Рэчы належалі камандзіру батарэі, Герою Савецкага Саюза Аляксандру Барданаву. У баях пад Белгарадам 7 жніўня 1943 года ён знішчыў 15 танкаў і 10 бронемашын праціўніка. Праз некалькі дзён воіны яго батарэі каля горада Ахтырка Сумскай вобласці падбілі пяць танкаў. Аляксандр Барданаў быў цяжка паранены, але застаўся ў страі да канца бою.

Прыцягвае ўвагу наведвальнікаў рэдкі фотаздымак. На ім — сляды смерці. Асколак, які прабіў фота 16 ліпеня 1943 года ў баях у вёсцы Сетуха Арлоўскай вобласці, смяротна параніў палітрука палка 124-й стралковай дывізіі, ураджэнца Віцебскай вобласці. Перад адыходам на фронт Фёдар Падсаднік сфатаграфаваўся разам з сястрой Марыяй.

6 ліпеня, на другі дзень бітвы пад Курскам, у бой з 20 варожымі самалётамі ўступіў беларускі лётчык Аляксандр Гаравец. Падбіўшы дзевяць з іх, ён загінуў. Пасмяротна Аляксандру Канстанцінавічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Месца яго гібелі ўстанавілі праз 14 гадоў пасля вайны. У 1957 годзе астанкі героя пахаваны ў вёсцы Зорынскія Двары Іўнянскага раёна Белгарадскай вобласці.

АБАРОНА ЛЕНІНГРАДА

Амаль 900 доўгіх дзён і начэй доўжылася блакада Ленінграда. Гэта самая працяглая і страшная аблога горада за ўсю гісторыю чалавецтва. Ва ўсёй сусветнай гісторыі няма ёй роўных і па колькасці ахвяр: каля мільёна чалавек не вынеслі голаду і холаду, абстрэлаў і бамбёжак. Аднак горад выстаяў. Калі б Ленінград здаўся, то быў бы сцёрты з твару зямлі.

Сярод абаронцаў Ленінграда былі і беларусы. Эскадрай караблёў Балтыйскага флоту камандаваў ураджэнец Гомельскай вобласці віцэ-адмірал Валянцін Дрозд. Караблі абаранялі горад і ўдзельнічалі ў яго прарыве. Эсмінец «Стойкі» быў перайменаваны ў эсмінец «Віцэ-адмірал Дрозд» пасля гібелі Валянціна Пятровіча 29 студзеня 1943 года. У памяць аб ім засталіся фуражка, блакнот віцэ-адмірала і стужкі да бесказырак.

Дзённік блакадніка Уладзіміра Самойлава — адзін з унікальных экспанатаў музея. Пенсіянер вёў падрабязныя запісы таго, што адбывалася ў абложаным горадзе. Запісаў убачанае ледзь не да апошніх дзён свайго жыцця. Блакаду Уладзімір Канстанцінавіч не перанёс. Дзённік, а таксама іншыя рэчы блакадніка, у музей перадаў яго ўнук Марк, які разам з маці эвакуяваўся з горада па «дарозе жыцця».

У музеі захоўваецца вышытая сурвэтка з надпісам «Папочке от Люды», якую ў падарунак ад дачкі атрымаў супрацоўнік франтавой газеты «За Совецкую Беларусь» Кандрат Крапіва.

Уладзімір Канстанцінавіч Самойлаў нарадзіўся ў Санкт-Пецярбургу. Да 1914 года працаваў у Магілёве начальнікам участка Лібава-Роменскай чыгункі. Затым быў запрошаны ў Санкт-Пецярбург на Пуцілаўскі (з 1934 года — Кіраўскі) завод. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў ужо на пенсіі. Першыя дзённікавыя запісы, датаваныя снежнем 1940 года — студзенем 1941-га, звязаны з хваробай і смерцю жонкі. Запісы аднаўляюцца з 22 чэрвеня 1941-га, а з 1 верасня становяцца больш падрабязнымі і грунтоўнымі. З пачаткам блакады Уладзімір Канстанцінавіч старанна апісвае ўсе бакі жыцця Ленінграда. Вядома, значная частка нататак прысвечана галоўнай праблеме — здабычы харчавання, але адначасова з гэтым Уладзімір Канстанцінавіч цікавіўся навінамі з фронту, хваліў ленінградцаў за цярпенне і стойкасць, верыў, што пераможам. Праўда, з кожным тыднем, слабеючы ад голаду, ужо не надта спадзяваўся дажыць да перамогі.

Яго старэйшая дачка Алена Байрашэўская была салісткай Дзяржаўнага ансамбля песні і танца РСФСР. У адпаведнасці з урадавай тэлеграмай з Масквы ансамбль быў пакінуты ў блакадным горадзе «для ўмацавання маральнага духу яго абаронцаў і жыхароў». Артысты ансамбля выступалі ў франтавых зямлянках, шпіталях, на караблях Балтыйскага флоту, у цэхах заводаў. Часам для таго, каб даць канцэрт, даводзілася ісці па гурбах прамерзлага снегу блакаднага Ленінграда з аднаго яго канца ў другі. Бывалі выпадкі, калі хтосьці з асабліва аслабелых ад голаду артыстаў не даходзіў да месца канцэрта. Увесну 1942 года, калі ў ансамблі засталося менш за палову яго складу, ён быў эвакуяваны па «дарозе жыцця» ў горад Сокал Валагодскай вобласці, а затым у Горкі. Пасля вызвалення Беларусі Алену Байрашэўскую запрасілі ў Мінск у якасці салісткі Белдзяржфілармоніі.

БІТВА ЗА ДНЯПРО

Бітва за Дняпро, якая пачалася ў верасні 1943 года, стала рэдкім у гісторыі войнаў прыкладам хуткага фарміравання на шырокім фронце буйной воднай перашкоды. І ўсё гэта — пры моцным супраціўленні праціўніка.

На працягу доўгага часу ў музеі экспануецца кіцель Героя Савецкага Саюза генерал-маёра танкавых войск магілёўца Мітрафана Зіньковіча. Войскі 6-га гвардзейскага танкавага корпуса пад яго камандаваннем у ліку першых фарсіравалі Дняпро на поўдзень ад Кіева і авалодалі плацдармам. Пры пераправе генерал быў смяротна паранены. Прабіты асколкам кіцель баявыя таварышы перадалі жонцы Мітрафана Іванавіча. Яго зямляк, Іван Якубоўскі, за фарсіраванне Дняпра, а таксама вызваленне Кіева і Фастава атрымаў першую зорку Героя.

Адзін з эпізодаў фарсіравання Дняпра адлюстраваны ў інсталяцыі. Артылерыйскі разлік пад камандаваннем гвардыі старшага сяржанта Івана Самбука на самаробным плыце з 122-міліметровай гаўбіцай перапраўляецца на супрацьлеглы бераг. Не чакаючы інжынерных часцей, артылерысты змайстравалі з бярвення плот, пагрузілі на яго зброю — і ў выніку замацаваліся на правым беразе ракі, чым забяспечылі баявую падтрымку пяхоце. За баі на Курскай дузе, а таксама за фарсіраванне Дзясны, Дняпра і Прыпяці Івану Самбуку прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. На чале разліку 122-міліметровай гаўбіцы, прадстаўленай у інсталяцыі, ён з баямі дайшоў да Эльбы і Прагі. Агнём гаўбіцы былі знішчаны 7 танкаў (хоць яна не прызначана для гэтага), 18 бронетранспарцёраў, 89 кулямётаў, 39 дзотаў і 29 дотаў гітлераўцаў. У музей зброю перадалі з воінскай часці, у якой яна захоўвалася пасля вайны.

СТАЯЛІ НАСМЕРЦЬ

На працягу 73 дзён вайскоўцы, маракі і жыхары Адэсы абаранялі свой горад. Медалём «За абарону Адэсы» ўзнагароджаны і камісар 8-й брыгады марской пяхоты, ураджэнец Магілёўшчыны Генадзь Вішнеўскі. Абарона Севастопаля доўжылася 250 дзён. З 80 тысяч чалавек эвакуяваць удалося толькі тры. Усе, хто застаўся ў акружаным горадзе, ужо былі героямі. Крокамер, гадзіннік і пасведчанне контр-адмірала Льва Уладзімірскага, які камандаваў эскадрылляй караблёў Чарнаморскага флоту, а з мая 1943 года — усім Чарнаморскім флотам, можна ўбачыць у экспазіцыі. Тут жа — і ўзнагароды, а таксама падзякі беларусам, якія адзначыліся пры абароне Кіева.

Двойчы быў захоплены гітлераўцамі і двойчы вызваляўся горад-герой Керч. У лістападзе 1943 года высадку дэсанта на Керчанскі паўвостраў на чале самалётаў «Іл-2» падтрымліваў Герой Савецкага Саюза Мікалай Юхотнікаў. У адным з баёў маёр падпаліў два танкі праціўніка. За абарону і вызваленне Каўказа і Кубані лётчык быў узнагароджаны імянным гадзіннікам ALPHA. У абароне Каўказа ўдзельнічаў і Герой Савецкага Саюза Леанід Буткевіч. У баях за Крым, Каўказ і Кубань беларускі снайпер знішчыў 327 фашыстаў. З вінтоўкі, уручанай яму ў 1943 годзе камандаваннем Чарнаморскай групы войскаў Закаўказскага фронту, Буткевіч знішчыў 63 гітлераўцы.

Захоўваецца ў музеі і франтавы дзённік Галіны Дакутовіч, штурмана 46-га гвардзейскага Таманскага авіяпалка лёгкіх начных бамбардзіроўшчыкаў. Адна з «начных ведзьмаў», як называлі лётчыц немцы, здзейсніла 136 баявых вылетаў. Як стала вядома з дзённікавых запісаў, падчас адной з загрузак самалёта на Галіну Дакутовіч наехала машына. Яна атрымала вельмі сур'ёзную траўму пазваночніка. Нягледзячы на невыносны боль, працягвала лятаць. Першага жніўня 1943 года пры выкананні баявога задання згарэла ў самалёце. Пахавана ў брацкай магіле ў сяле Рускае, што ў Краснадарскім краі.

МЕДЫКІ НА ФРОНЦЕ

Фарсіравала Дняпро і санінструктар Зінаіда Самсонава, якая пад варожым агнём вынесла з полю бою і пераправіла на левы бераг ракі 30 параненых салдат. Жанчына загінула ў студзені 1944 года падчас вызвалення Беларусі. Удастоена звання Героя Савецкага Саюза. Гэта ёй прысвяціла свой верш «Зінка» вядомая пісьменніца Юлія Друніна, аднапалчанка Самсонавай.

Роля медработнікаў на вайне паказана ў інсталяцыі «Франтавы медсанбат». Падлічана, што прыкладна 73% параненых вярталіся ў шэрагі Чырвонай Арміі дзякуючы франтавым медыкам. Ураджэнкі Беларусі Герой Савецкага Саюза Зінаіда Тусналобава-Марчанка, Марыя Гарачук і Соф'я Кунцэвіч былі ўзнагароджаны медалём Міжнароднага Чырвонага Крыжа «Фларэнс Найтынгейл». Адна Соф'я Адамаўна за чатыры дні вынесла з поля бою 147 параненых салдат.

На групавым фотаздымку — медработнікі асобнай роты медыцынскага ўзмацнення, якая дзейнічала на самых складаных участках, дзе дапамога ўрачоў была патрэбна больш за ўсё: Алена Юшына, Ганна Казак, Лідзія Кацельнікава, Клаўдзія Швындзянкова. Фотаздымак, як і іншыя рэчы, перадала ў музей Лідзія Кандратаўна, для якой вайна пачалася ў 16 гадоў. Удзельнічала ў абарончых баях ва Украіне, у Сталінградскай бітве і бітве на Курскай дузе, вызваляла Беларусь, Польшчу, дайшла да Берліна. Жанчына была кансультантам па стварэнні інсталяцыі «Франтавы медсанбат».

***

Напрыканцы наведвальнікі маюць магчымасць паглядзець некалькі поўнафарматных фільмаў па тэмах, прадстаўленых у гэтай зале музея. Работу савецкага тылу ілюструе кінастужка Дзігі Вертава «Табе, фронт!», адна з серый фільма «Чаму мы змагаемся» прысвечана бітве за Вялікабрытанію, стужка «Жыла была дзяўчынка», у якой распавядаецца аб жыцці ў блакадным Ленінградзе, была знята адразу пасля вызвалення горада.

Беларусь вызвалілі крыху пазней. Толькі спачатку былі доўгія тры гады акупацыі, пра якія мы раскажам у наступны раз.

Вераніка КАНЮТА,
Сяргей КЛЮЦКІ, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваенна-франтавой гісторыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Артылерыйскі разлік пад камандаваннем гвардыі старшага сяржанта Івана Самбука на самаробным плыце з 122-міліметровай гаўбіцай пераправіцца на супрацьлеглы бераг.

Інсталяцыя «Франтавы медсанбат».

ПОДЗВІГІ Ў ТЫЛЕ

У ліпені-жніўні 1941 года з усходніх абласцей Беларусі было эвакуявана каля 1 мільёна 500 тысяч чалавек, 129 прадпрыемстваў. Размясціўшыся ва ўсходняй частцы Савецкага Саюза, яны наладжвалі выпуск ваеннай прадукцыі. Напрыклад, у Свярдлоўску Гомельскі станкабудаўнічы завод імя Кірава выпускаў славутыя «Кацюшы» і боепрыпасы да іх. Інструменты і партсігар з надпісам «Лепшаму слесару г. Свярдлоўска», падараныя ў 1944 годзе Герою Сацыялістычнай Працы Мікалаю Каменскіх, можна ўбачыць у адной з вітрын. Побач знаходзяцца ўзоры той зброі, якая выпускалася на эвакуяваных прадпрыемствах: пісталеты-кулямёты, вінтоўкі, супрацьтанкавыя ружжы, карабіны, пісталеты, танкавы і авіяцыйны кулямёты.

Аб важнай місіі працаўнікоў тылу ў гады Вялікай Айчыннай вайны сведчыць і інсталяцыя «Падлетак ля станка», дзе ўвасоблены зборны вобраз усіх тых, хто чым мог дапамагаў фронту. Як мінскі школьнік Леў Кнюкшто, які з 13 гадоў працаваў токарам на будоўлях Башкірскай ССР. Яго камсамольскі білет, пасведчанне токара 3-га разраду і медаль «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.» экспануюцца ў музеі. Такіх узнагарод былі ўдастоены больш як 16 мільёнаў працаўнікоў тылу, у тым ліку тысячы юнакоў і дзяўчат, якія замянялі ля станкоў сваіх бацькоў і старэйшых братоў, што пайшлі на фронт.

З гэтай вінтоўкі Герой Савецкага Саюза Леанід Буткевіч знішчыў 63 гітлераўцы.



Блакадны дзённік Уладзіміра Самойлава.